Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

5 ЖНІЎНЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 149 (28259)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

НАРОДНАЯ МАРКА

**Сваё месца на рынку**

СТАР. 4



**Ад дыджэя да кіраўніка**

СТАР. 5



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

# ТОЛЬКІ НЕБА І ТЫ



Фота БЕЛТА.

У Гродзенскім аэраклубе кожны ахвотны можа праверыць сябе на смеласць.

■ Бліжэй да людзей

## І ДАРАДЦЫ — ТАКСАМА

### Ці можа паштальён прымаць аплату за паслугі ЖКГ?

**У Петрыкаўскі раённы вузел паштовай сувязі мы з'явіліся пасля дзевяці гадзін раніцы, калі ў рэйс адпраўлялася машына з грузам. А менавіта: перыядычнымі выданнямі, пісьмамі, пасылкамі, рознай карэспандэнцыяй, пенсіямі, таварамі шырокага ўжытку і г.д.**

— Наш маршрут, — заўважаюць **кіроўца Ігар ГАРОШКА** і **паштальён па суправаджэнні Сяргей КУЦЮРУБА**, — у Кашэвічы. Адлегласць няблізкая: туды і назад трэба пераадолець больш за 190 кіламетраў. У райцэнтр вернемся ў канцы рабочага дня, калі акажам людзям усе неабходныя паштовыя паслугі.




**Паштальён па суправаджэнні Сяргей КУЦЮРУБА *(злева)* з кіроўцам Ігарам ГАРОШКАМ гатовы адправіцца па маршруце Петрыкаў—Кашэвічы.**

Да размовы падключаецца **начальнік РВПС Валянціна ЯЎЛАШ**:

— Сёння, пачынаючы з васьмі гадзін, у падобныя рэйсы адправіліся ўжо пяць аўтамашын па маршрутах: Фаставічы, Колкі, Бабунічы, Брынёў, Мышанка. Гэта называецца мотадастаўка, якой абслугоўваюцца жыхары 64 вёсак і пасёлкаў, дзе няма аддзяленняў паштовай сувязі. Заўважу, што ўсяго ў раёне 125 населеных пунктаў, якія мы ахопліваем сваімі клопатамі. І яшчэ: мотадастаўка дзейнічае кожны дзень, акрамя, вядома, выхадных.

— Давайце, Валянціна Леанідаўна, удакладнім наступныя пытанні: ці могуць паштальёны па суправаджэнні прымаць ад насельніцтва аплату за паслугі ЖКГ і ці могуць яны выканаць заказ па дастаўцы таму ці іншаму чалавеку набытых пральнай машыны або халадзільніка?

— Сумненняў няма: могуць. І не толькі гэта. Яны прымаюць ад вяскоўцаў плацяжы за карыстанне газам, за паслугі электра- і сотавай сувязі, радыё, плацяжы ў бюджэт, задавальняюць просьбы па забеспячэнні іх таварамі шырокага ўжытку як харчовага, так і прамысловага кшталту. Вядуць падпіску на газеты. Што вельмі зручна для людзей, бо ім не трэба дабірацца да тых населеных пунктаў, дзе ёсць паштовыя аддзяленні.

СТАР. 3

■ Алімпійскі дзённік

## ЗА КРОК ДА СТАРТУ

**Сёння ноччу ў Бразіліі пройдзе цырымонія адкрыцця XXXI Алімпійскіх гульняў**




**На стадыёне «Маракана» нарэшце запаліцца алімпійскі агонь, у Рыа-дэ-Жанэйра будзе яшчэ 5 жніўня, у Беларусі ўжо ноч 6-га.**

Факел з агнём быў запалены ў Грэцыі ў старажытнай Алімпіі 21 красавіка. А ўжо 3 мая прыбыў у сталіцу Бразіліі, дзе быў дадзены старт нацыянальнай эстафеце алімпійскага агню, факел пераадолеў 20 тысяч кіламетраў па зямлі і больш за 10 тысяч кіламетраў па паветры. Завершыцца эстафета на стадыёне «Маракана» падчас урачыстай цырымоніі адкрыцця Гульняў.

Звычайна імя чалавека, які запаліць алімпійскі агонь, трымаецца ў таямніцы да апошняга моманту, але ў гэтым годзе ў грамадскасці ўжо ёсць некаторыя здагадкі. Легендарны бразільскі футбаліст Пеле паведаміў прадстаўнікам СМІ, што атрымаў падобнае запрашэнне ад кіраўніка МАК Томаса Баха. Калі ў Пеле атрымаецца перанесці запланаваную паездку за межы Бразіліі, ён застанецца ў Рыа-дэ-Жанэйра і запаліць агонь на стадыёне «Маракана».

СТАР. 13

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Наталля КАЧАНАВА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Сёння ёсць неабходнасць гаварыць аб удасканаленні нормаў, накіраваных на папярэджанне п'янства і алкагалізму, у тым ліку і аб праблеме даступнасці алкаголю на прылаўках гандлёвых аб'ектаў. Пытанне рэалізацыі алкаголю ў кругласутачных магазінах, на АЗС, у іншых гандлёвых аб'ектах будзе дадаткова разгледжана. Сёння бачым, што ў розных ведамстваў няма адзінага пункту гледжання на гэтае пытанне. Пра гэта трэба гаварыць, бо, нягледзячы на зніжэнне ўжывання алкаголю, праблема застаецца актуальнай».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 5.08.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9926 | ▼ |
| Еўра | 2,2191 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0300 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0803 | ■ |

ISSN 1990 - 763X

16149>

9 771990 763008